***А. Д. Цапалава***
*Навук. кір.* ***Н. П. Цімашэнка,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# МАРФАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА АЗНАЧЭННЯЎ У МОВЕ КАЗАК АЛЕНЫ МАСЛА

Алена Масла – сучасная пісьменніца, творчасць якой прадстаўлена аўтарскай казкай, якая адрозніваецца ад казкі фальклорнай, мае сваю эстэтычную канцэпцыю [1]. У сваім даследаванні мы звяртаемся да марфалагічнай характарыстыкі азначэнняў, якія выкарыстоўваюцца Аленай Масла ў казках.

Мэта работы – вызначэнне асаблівасцей марфалагічнай арганізацыі дапасаваных і недапасаваных азначэнняў. Для вызначэння марфалагічных груп азначэнняў у мове казак А. Масла вылучана 300 азначэнняў з твораў зборніка «Таямніца закінутай хаты» [2]. Сярод дапасаваных у мове твораў А. Масла найбольшую групу ўтвараюць азначэнні, выражаныя прыметнікамі. Іх налічваецца 126, прычым азначэнні, выражаныя якаснымі прыметнікамі, пераважаюць: «*на* ***пусты*** *панадворак*» [2, с. 57]. Пісьменніца рэдка выкарыстоўвае магчымасць якасных прыметнікаў утвараць эмацыянальна-экспрэсіўныя адцэнні. Знойдзена ўсяго 5 такіх азначэнняў: «*на* ***тоненькіх*** *павуцінках*» [2, с. 8]. Азначэнняў, выражаных прыметнікамі, якія ўтвараюць формы ступеней параўнання, знойдзена толькі 5: «*трапляюць* ***самыя лепшыя*** *казкі*» [2, с. 4]. Азначэнняў, выражаных адноснымі прыметнікамі, вылучана 28: «*аб* ***калодзежнай*** *вадзе*» [2, с. 60]. А. Масла выкарыстала толькі 8 прыналежных азначэнняў у разгледжаных казках: «*не чакаў* ***Змітраковых*** *запытанняў*» [2, с. 58].

Сярод азначэнняў знойдзена 13, выражаных дзеепрыметнікамі залежнага стану прошлага часу («*стаіць* ***закінутая*** *хатка*» [2, с. 57]) і 1 азначэнне незалежнага стану прошлага часу: «*старонкі* ***адсырэлых*** *кніжак*» [2, с. 60]. Пераважную колькасць азначэнняў, выражаных займеннікамі, складаюць прыналежныя, што ўласціва жанру казкі: «*казала* ***твая*** *бабуля*» [2, с. 57]. Азначэнні, выражаныя дзеепрыметнымі і прыметнікавымі зваротамі, сустракаюцца ў мове казак А. Масла не так часта, што тлумачыцца аўдыторыяй казак, імкненнем да спрашчэння ўспрымання тэксту. Недапасаваныя азначэнні ў мове твораў А. Масла выражаюцца, як правіла, назоўнікамі з прыназоўнікам і без яго. Налічана 36 такіх азначэнняў: «*на ўслончык* ***ля калодзежа***» [2, с. 60]. Недапасаваныя азначэнні, выражаныя інфінітывамі («*не спытаў дазволу* ***зайсці***» [2, с. 57]), прыслоўямі («*вада празрыстая і чыстая,* ***як і раней***» [2, с. 57]) і непадзельнымі словазлучэннямі («*расліны* ***з усяго свету***» [2, с. 16]), прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі. Мова казак А. Масла дастаткова багатая на выкарыстанне прыдаткаў, якія характарызуюць як прадметы, так і асоб: «*Шчыравалі* ***працаўніцы****-пчолкі*» [2, с. 18]. Такім чынам, у мове твораў А. Масла вылучаюцца як дапасаваныя, так і недапасаваныя азначэнні. Большую колькасць азначэнняў у разгледжаных казках складаюць дапасаваныя – 238 азначэнняў. Недапасаваных – 70. Сярод дапасаваных найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца азначэнні, выражаныя прыметнікамі. Сярод недапасаваных найбольш частотнымі з’яўляюцца азначэнні, выражаныя назоўнікамі.

## Літаратура

1 Пятроўская, Т. М. Казкі для дзяцей і дарослых: чароўныя творы Алены Масла / Т. М. Пятроўская // Маладосць. – 2017. – № 5. – С. 91–95.

2 Масла, А. Таямніца закінутай хаты / Алена Масла. – Мінск : «Мастацкая літаратура», 2005. – 68 с.